


**Установа адукацыі**
**“Полацкая дзяржаўная гімназія №2”**
**Полацкі раён Віцебская вобласць**


**Рэспубліканскі конкурс**
**“Дарогамі ведаў”**

# Я ад дрэва твайго лісток, залаты мой спрадвечны горад


**Аўтары: Катовіч Маргарыта Уладзіміраўна, бібліятэкар УА“ПДГ №2”;**
**Лапарэвіч Жанна Фёдараўна, намеснік дырэктара па ВР УА ”ПДГ №2”**
**г.Полацк пр-т Ф.Скарыны, 33, тэл.46-32-54**



**г.Полацк, 2021**

# Змест


**Падарожжа з КНІГАЙ па Полацку** 4

**Падарожжа ПЕРШАЕ**
**“Ад Ізяслава–кніжніка да сучаснага кнігадрукавання”** 6

**Падарожжа ДРУГОЕ**
**“Бібліятэка - скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці”** 15

**Падарожжа ТРЭЦЯЕ**
***“Народным мы завемся аб’яднаннем, а значыць, абавязаны тварыць”*** 22

- **Іх імёны ў назвах вуліц старыжатныга Полацка**

**Падарожжа ЧАЦВЁРТАЕ**
**"Рыцарская культура сярэдневяковага горада”** 28

- **Партфель экскурсавода**




*З Полацка пачаўся свет*

*Р. Барадулін*

***Нам кніга-вечнае святло,***
***Крыніца ведаў, цуд бясконцы!***
***І параўнацца з ёй магло б,***
***Відаць, у свеце толькі сонца.***

*М. Пазнякоў*

*“Ад Полацка пачаўся свет…”, але перш свет нарадзіўся разам з ім- таксама , як пачынаецца новы свет з першым крыкам кожнага немаўляці.*

*Старажытная полацкая зямля, багатае гістарычнае мінулае якой звязана са станаўленнем беларускай дзяржавы, праваслаўя, адукацыі і культуры... Багатая гісторыя Полацка, не можа не вызываць цікавасці і павагі. Гісторыя горада стваралі выдатныя асобы-гонар усёй нашай краіны: святая заступніца зямлі беларускай прападобная Еўфрасіння Полацкая, першадрукар Францыск Скарына, асветнік і публіцыст Сімяон Полацкі, заснавальнік беларускай класічнай літаратуры XIX стагоддзя Ян Баршчэўскі, беларускія жывапісцы В.Ваньковіч і І.Хруцкі, кінарэжысёр Ю.Тарыч і многія іншыя вядомыя ўсяму свету людзі, якія з’яўляюцца прыкладам адданасці Радзіме і служэння свайму народу. Палітычная і эканамічная веліч Полацка падтрымлівалася за кошт багатага культурнага жыцця. Ён вядомы сваімі кніжнымі традыцыямі яшчэ з 11 стагоддзя.*

*Гісторыя Полацка шматпакутная, у ёй адзначаны і перамогі, і перыяды цяжкіх выпрабаванняў. Колькі разоў бушавалі на полацкай зямлі спусташальныя войны, колькі разоў ліхалецці замахваліся на гонар і волю- столькі разоў дзеці горада аднаўлялі і ўслаўлялі яго. І ішлі далёка ў свет са святлом веры, са словам ведаў, з радасцю і натхненнем. І цяпер іхні агонь - у нашых далонях. І імя яму - Памяць..*

*Сённяшні Полацк працягвае выконваць вялікую місію. Ён дынамічна развіваецца. Нам ёсць кім і чым ганарыцца. Полацк упэўнена глядзіць наперад, у будучыню. Горад – сталы і мудры- стаіць на беразе Ракі Часу. Слава яго- непахісная, гонар яго – неаспрэчны. Ён сам цэлы сусвет. Ад яго пачаўся свет для*



*кожнага, хто нарадзіўся на гэтай святой зямлі. Ім узбагаціўся свет кожнага, хто прыйшоў і дакрануўся.*

*Адсюль, з блаславёнай зямлі, з высокага дзвінскага берага, дзе стромкім ветразем узносіцца ў неба Сафія, адпраўляліся ў падарожжа лёсу слынныя палачане.*

***Тут пачынаецца і наш шлях-падарожжа па незвычайнай і пазнавальнай карце горада, якая складаецца з мясцін, назваў вуліц, гарадскіх будынкаў, помнікаў, звязанных адным словам-КНІГА.***

***КНІГА.*** *Бясцэнны скарб, крыніца ведаў, мудрасці і духоўнасці. Так было стагоддзі таму, так застаецца сёння. На двары імклівае XXI стагоддзе, час касмічных хуткасцяў і высокіх тэхналогій.. Здавалася б, друкаванае слова засталося ў мінулым, але... Першы крок да спасціжэння ведаў, як і стагоддзі таму, дзіця робіць, разгортваючы буквар...*

*Полацк-горад кніжнай асветы. І сёння мы, гартаючы кніжныя старонкі, шукаем ісціны жыцця, пазнаём глыбіню сусвету.*





# Падарожжа ПЕРШАЕ

## Ад Ізяслава-кніжніка да сучаснага кнігадрукавання

Мы жывём на слыннай зямлі, у гістарычным і духоўным сэрцы краіны. Мы -нашчадкі бясцэннай спадчыны, пакінутай нам славутымі продкамі.На старонках кніг вучоныя, пісьменнікі, філосафы імкнуліся зафіксаваць свае, цяжкаю працаю здабытыя веды, свой вопыт, свае думкі і такім чынам захаваць іх для нас . Дзе вытокі гэтай спадчыны? Што стала перадумовай для стварэння першай беларускай кнігі?

**Князь Ізяслаў** (?-1001), сын князёўны Рагнеды, першы з усходнеславянскіх князёў якога летапісцы называюць “кніжнікам”. Менавіта ён распаліў светач асветы, увёў пісьменства і навучанне грамаце, пачаў збіраць рукапісныя кнігі, якія склалі першую з вядомых у Беларусі бібліятэку, якая потым існавала ў Сафійскім саборы, узведзеным у час княжання Усяслава Брачыслававіча. У яе скрыпторыі пад мігценне свечкі рупліва перапісвала кнігі прападобная Еўфрасіння…



Князь Ізяслаў



Вул. Замкавая, 1



САФІЙСКІ САБОР

Саборы г.Полацка



Князёўна Прадслава – **прападобная Еўфрасіння Полацкая** ((каля1101-1005)-1167), унучка славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XI стагоддзі, але і ўсю шматвекавую гісторыю Беларусі. Яна выбірае не лёс князёўны, а лёс манахіні, асветніцы і кніжніцы, лёс ігуменні Полацкай абіцелі.І на гэтым шляху яна дасягае святасці. Спачатку Еўфрасіння перапісвала і перакладала кнігі ў Сафійскім саборы.. А калі бацька пабудаваў для яе манастыр, перайшла ў яго: з цягам часу там пачалі працаваць майстэрні па перапісванні кніг.



Прападобная
Еўфрасіння Полацкая



Помнік Еўфрасінні Полацкай

***Скрыжаванні вуліц Камуністычнай і вуліцы Е. Полацкай.***

*Устаноўлены ў 2000 г. Аўтар, член Саюза мастакоў І. Голубеў.*

Іменем Еўфрасінні Полацкай у г.Полацку названы:



***СПАСА – ЕФРАСІННЕЎСКІ МАНАСТЫР***

***Вул.Е Полацкай,89***



***ВУЛІЦА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ***

***Вул.Е Полацкай***



***УА "ПОЛАЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №18***

***ІМЯ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ"***

***Вул.Хруцкага,24***

Славуты палачанін **Францыск Скарына** (да1490- каля 1551), беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, які пакінуў нашчадкам перакладзеныя на блізкую да народнай мовы кнігі Бібліі. Ён імкнуўся, каб яго землякі чыталі, вучыліся, каб гучала роднае слова ў святых тэкстах, якое, як і жыццё, дадзена Богам кожнаму народу. *"...Любіце кнігу, бо яна - крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы..."*. Гэтыя словы звернуты да ўсіх. І ягоны запавет - на ўсе вякі: покуль будзе планета Зямля кружыць у нябесных прасцягах.



Францыск Скарына



Помнік Францыску Скарыну

**Праспект Ф.Скарыны.**

*Устаноўлены ў 1974г.*
*Скульптары: А.Глебаў, І.Глебаў, А.Засціцкі*
*Архітэктар В. Марокін*

## Іменем Ф. Скарыны ў г.Полацку названы:



**Праспект імя Ф.Скарыны**



**вуліца імя Ф.Скарыны**



**плошча імя Ф.Скарыны**



***УА "ПОЛАЦКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ГІМНАЗІЯ №1 ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ"***
***Вул. Камуністычная,13***



***ГУК "ПОЛАЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ"***
***Вул. Гогаля,15***



***Полацкае рэспубліканскае ўнітарнае паліграфічнае прадпрыемства "СПАДЧЫНА Ф.СКАРЫНЫ"***
***Вул. Ю.Гагарына,8***



Сімяон Полацкі

**Сімяон Полацкі** (1629-1680) (Пятроўскі-Сітніяновіч Самуіл Гаўрылавіч), першы прафесійны паэт і драматург, пісьменнік, філосаф, перакладчык, педагог, царкоўны і грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў Полацку. Пачынаў шлях у навуку ў родным горадзе. Стаў праваслаўным манахам і настаўнічаў у брацкай школе пры Богаяўленскім манастыры. Вакол манастыра згуртаваліся паэты і пісьменнікі. Гэта была першая школа беларускіх літаратараў. Арганізаваў у Маскве першую свецкую друкарню, якая атрымала права выдаваць кнігі без спецыяльнага дазволу патрыярха. У кнігах у С. Полацкага багацце думак, непаўторнасць вобразаў, трапнасць назіранняў за жыццём. *“Тако читаяй книги божественны аки по нужде будет умудренны”.* Дзякуючы свайму таленту і справам, С.Полацкі годна ўвайшоў у літаратуру і гісторыю беларускага і рускага народаў.



Помнік Сімяону Полацкаму

***Праспект Ф. Скарыны.***
*Скульптар А. Фінскі*

**Помнікі г.Полацка**

## Іменем Сімяона Полацкага ў г.Полацку названы:



***ШКОЛА – ТЭАТР СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА (ГПК)***

***Вул.Гогаля,15***



***МУЗЕЙ –БІБЛІЯТЭКА ІМЯ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА***

***Вул. Ніжне–Пакроўская, 22***



### *Вул. Ніжне-Пакроўская, 22*



Музей Беларускага кнігадрукавання

Адзіным у Беларусі з'яўляецца, адчынены ў 1990 г. у будынку былой Брацкай школы Богаяўленскага манастыра **Музей беларускага кнігадрукавання**. 15 залаў падрабязна знаёмяць з гісторыяй пісьменства, кніжнай ілюстрацыі, паліграфіі. У экспазіцыі прадстаўлены рукапісныя выданні, арыгіналы рарытэтных старадрукаў: "Евангелле вучыцельнае" 1595г., "12 прамоў" Іераніма Фалецкага 1558г. Самая тоўстая кніга"Вока Царкоўнае" 1641г. мае 1185 аркушаў. Самая вялікая па памеры – "Каранацыйны зборнік Аляксандра ІІ" У вышыню дасягае метр, яе вага - 26 кілаграмаў. Ёсць калекцыя кніжак-мініяцюр памерам не больш за карабок запалак. Тут захоўваецца самая поўная і вялікая калекцыя кніг-лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі", які праводзіцца з 1960г. Штогод праводзіцца выстава выданняў-лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу "Лепшыя кнігі Беларусі".

### *Вуліца Ю.Гагарына, 8*

Рэспубліканскае унітарнае паліграфічнае прадпрыемства "Спадчына Ф.Скарыны"

***Жаданне вучыцца, удасканальвацца і адкрываць новыя магчымасці-і ёсць тое галоўнае, што яднае, полацкіх паліграфістаў з беларускім першадрукаром.***

*Дырэктар Полацкага РУПП "Спадчына Ф . Скарыны" М.Ільюшонак*

На радзіме беларускага першадрукара сёння плённа працуюць яго нашчадкі. У 1918 г. на базе прыватнай была створана гарадская друкарня, якая паклала пачатак нараджэнню паліграфіі на Полаччыне. Пасля Вялікай Айчыннай вайны друкарня размяшчалася на вул. Войкава, у 1948г. пераехала на вул. Сака і Ванцэці, дзе знаходзілася да 1990г. У 1992г. створана паліграфічнае прадпрыемства "Спадчына Ф. Скарыны". Прадпрыемства спецыялізуецца на выпуску дапаможнікаў, сшыткаў, паштовак, плакатаў, кніг.





Знак літары “Ў”

## *Праспект Ф.Скарыны*

*Аўтар знака - полацкі мастак Ігар Куржалай.*

Памятны знак літары **“Ў” (“У” кароткай)** у беларускім алфавіце ўстаноўлены ў скверы ў 2003 годзе, падчас 10-х юбілейных святкаванняў Дня беларускага пісьменства.

*Музеі г.Полацка*



# Падарожжа ПЕРШАЕ

## "Ад Ізяслава- кніжніка да сучаснага кнігадрукавання"



**Мэта экскурсіі:**

- Духоўнае і патрыятычнае выхаванне на прыкладзе дзейнасці знакамітых асветнікаў Полацка.

**Задачы экскурсіі:**

- 1.Паказаць значэнне горада Полацка ў духоўным і культурным развіцці Беларусі са старажытных часоў да нашага часу.
- 2. Пазнаёміць з вытокамі беларускага кнігадрукавання, з дзейнасцю знакамітых асветнікаў.



**Месца сустрэчы з групай:**

- вул. Замкавая.1
- (Сафійскі сабор)

**Працягласць экскурсіі:**

- 150 хвілін.



**Адлегласць маршрута:**

- 3 км



**Склад экскурсантаў:**

- дарослыя, вучні

**Від экскурсіі:**

- пешаходная, аўтобусная



# Маршрут экскурсіі

## "Ад Ізяслава- кніжніка да сучаснага кнігадрукавання"

| | |
|---|---|
| **СТАРТ** вул.Замкавая,1 | • 1. САФІЙСКІ САБОР |
| вул. Ніжне-Пакроўская, 22 | • 2.МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ |
| вул.Е.Полацкай | • 3.ПОМНІК Е.ПОЛАЦКАЙ |
| праспект Ф.Скарыны | • 4.ПАМЯТНЫ ЗНАК ЛІТАРЫ “Ў” |
| праспект Ф.Скарыны | • 5.ПОМНІК СІМЯОНУ ПОЛАЦКАМУ |
| праспект Ф.Скарыны | • 6.ПОМНІК ФРАНЦЫСКУ СКАРЫНУ |
| вул.Юрыя Гагарына,8 | • 7.Рэспубліканскае ўнітарнае паліграфічнае прадпрыемства “СПАДЧЫНА Ф.СКАРЫНЫ” |
| | • 8.ПЛОШЧА Ф.СКАРЫНЫ |

*Тэхналагічная карта экскурсійнага маршруту "Ад Ізяслава- кніжніка да сучаснага кнігадрукавання”*



# Маршрут экскурсіі. Падарожжа ПЕРШАЕ

## "Ад Ізяслава-кніжніка да сучаснага кнігадрукавання"




1 Сафійскі сабор
2 Музей беларускага кнігадрукавання
3 Помнік Еўфрасінні Полацкай
4 Помнік літары "Ў"
5 Помнік Сімяону Полацкаму
6 Помнік Францішку Скарыну
7 Друкарня "Спадчына Ф.Скарыны"
8 Плошча Ф.Скарыны

"Бібліятэка - скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці"

Старонкі гісторыі бібліятэк г.Полацка цесна пераплятаюцца з гісторыяй нашай краіны. Кожны яе перыяд рабіў свае акцэнты на напрамкі дзейнасці бібліятэк, прад'яўляў свае патрабаванні да арганізацыі бібліятэчнай справы. Чаго толькі не было за гэты час, колькі розных падзей адбылася, колькі пакаленняў чытачоў змянілася, колькі добрых спраў зроблена для жыхароў горада!.

## Бібліятэка Сафійскага сабора





*Вул. Замкавая,1 Сафійскі сабор*

Бібліятэка Сафійскага сабора была буйным культурным цэнтрам не толькі Полацкага княства, але і ўсіх усходнеславянскіх земель.Фонды старажытнай бібліятэкі фарміраваліся, па-першае, з літаратуры духоўнага зместу, неабходнай для жыцця і дзейнасці царквы. Улічваючы геаграфічнае становішча Полацка і наяўнасць у ім адукаваных людзей, былі ў бібліятэцы і кнігі свецкія, і нават тыя, якія належылі іншадумцам, што давала істотны штуршок развіццю адукаванасці і навукі. У кніжны збор маглі ўваходзіць і летапісы, якія тут жа і пісаліся, і літаратура філасофскага зместу. Такім чынам, да XVI стагоддзя бібліятэка Сафійскага сабора стала самай і шырока вядомай на беларускай зямлі.





Бібліятэка Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра

***Вул. Е. Полацкай, 89***

Асветніцкую справу святой палачанкі працягваюць у бібліятэках Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У свой час згубленая кніжная скарбніца аднаўлялася намаганнямі насельніц абіцелі. Манастырская бібліятэка славіцца фондам Л.В.Аляксеева. Знакаміты даследчык гісторыі полацкай зямлі асабіста перадаў яго ў манастыр. Бібліятэка працуе пры духоўна-асветніцкім цэнтры абіцелі.

У XVIII-XIX ст. цэнтрам асветы быў Полацкі езуіцкі калегіум. Яго бібліятэка з'яўлялася найбагацейшым айчынным кнігазборам. Створаная на базе калегіума акадэмія стала першай беларускай вышэйшай навучальнай установай традыцыі якой працягвалі Полацкі кадэцкі корпус (1835-1915) і **Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.** У 2005 годзе бібліятэцы Полацкага універсітэта прысвоены статус навуковай.





Бібліятэка Полацкага езуіцкага калегіума

***Вул. Стралецкая,4***

Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага



Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага знаходзіцца ў будынку былой Брацкай школы. Яна спалучае экспазіцыю з бібліятэкай і чытальнай залай. Значная ўвага надаецца педагагічнай, літаратурнай і выдавецкай дзейнасці С.Полацкага. Чытальная зала ў стылі XVII ст. Кніжныя шафы ў два ярусы, бюсты грэчаскіх філосафаў, глобус- самы вялікі ў Беларусі. У экспазіцыі шмат кніг пісьменніка, напрыклад: "Рыфмалагіён", "Вертаград мнагацветны" - самы вялікі зборнік вершаў у рускай паэзіі. У музеі–бібліятэцы праходзяць канферэнцыі, прэзентацыі, творчыя сустрэчы.

***Вул. Ніжне-Пакроўская, 22***

## ГУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Сёння Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма аб'ядноўвае 35 філіялаў Полацка і Полацкага раёна.***

### Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны



Гісторыя Полацкай цэнтральнай бібліятэкі пачынаецца з 1919г. У 1926г. бібліятэкі прысвоена імя Рэвалюцыі 1905г. У час Вялікай Айчыннай вайны ўсе кнігі былі знішчаны. У 1945г. была адчынена Полацкая абласная бібліятэка. У 1954г. бібліятэка рэарганізавана ў гарадскую і атрымала памяшканне, дзе знаходзіцца зараз. У 1964 годзе ёй прысвоена імя М.Астроўскага. А ў 1990 годзе ў гонар 500-годдзя Ф. Скарыны прысвоена імя знакамітага палачаніна. У 2013 годзе, пасля аб'яднання раённай і гарадской цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, цэнтральная бібліятэка імя Ф.Скарыны стала Цэнтральнай раённай бібліятэкай. Кніжны фонд - звыш 95 тысяч экзэмпляраў, якім карыстаюцца амаль 10 тысяч чытачоў.

***Вул.Гогаля, 15***

### Дзіцячая бібліятэка імя. Л.Талстога - філіял №1



*Адчынена ў 1948г.*

У цяжкі пасляваенны час для дзяцей адчынілася бібліятэка па вуліцы Леніна, *(вул. Ніжне-Пакроўская,33. Домік Петра I)*

В 1996г. бібліятэка атрымала новае памяшканне *(вул.Свярдлова, 17)* плошчу 344кв.м, дзе знаходзіцца зараз. Абслугоўвае дзяцей і педагогаў.

***Вул.Свярдлова,17***



### Бібліятэка імя А.І. Герцэна-філіял №2 **Адчынена ў 1947 г.**

З’яўляецца культурным цэнтрам мікраараёна “Спаскі”. Ў 1964 г. бібліятэцы прысвоена імя А. І. Герцэна.

***Вул. Касманаўтаў, 69***

### Бібліятэка імя Янкі Купалы-філіял №3 **Адчынена ў 1950 г.**

Бібліятека абслугоўвае дарослых і дзяцей мікраараёна “Марыненка”. У1964 г. бібліятэцы прысвоена імя Я. Купалы

***Вул. Марыненка, 42***

### Бібліятэка -філіял №4 **Адчынена ў 1967 г.**

Бібліятэка знаходзіцца ў мікраараёне “Ноўка” Абслугоўвае дарослых і дзяцей.

***5-ый. Зав. Тросніцкі, 44***

### Бібліятэка -філіял №5 **Адчынена ў 1974 г.**

Бібліятэка знаходзіцца ў мікраараёне “Грамы”, у памяшканні СШ№14. Абслугоўвае дарослых і дзяцей.

***Вул. Ленінградская, 87а***

### Дзіцячая бібліятэка імя. Я. Журбы- філіял №6 **Адчынена ў 1952 г.**

Бібліятэка знаходзіцца ў мікраараёне “Грамы”. У 1964 г. бібліятэкі прысвоена імя Янкі Журбы. Абслугоўвае дзяцей и педагогаў.

***Вул. Ленінградская, 47а***

### Бібліятэка -філіял №8 **Адчынена ў 2006 г.**

Бібліятэка знаходзіцца ў мікраараёне “Аэрадром”. Абслугоўвае дарослых і дзяцей.

***Вул. Зыгіна, 55***

### Бібліятэка імя Алеся Савіцкага-філіял №9 **Адчынена ў 2013 г.**

Бібліятэка рэарганізавана з Полацкай раённай бібліятэкі. Знаходзіцца ў мікраараёне “Задзвінне”. У 2006г. ёй прысвоена імя Алеся Савіцкага. У бібліятэцы знаходзіцца выстава «Зямляк, Партызан, Пісьменнік”, прысвечаная А.Савіцкаму, дзе прадстаўлены біяграфічныя дакументы і асабістыя рэчы пісьменніка. Бібліятэка абслугоўвае дарослых і дзяцей.

***Вул.Дзяржынскага, 52а***



# Падарожжа ДРУГОЕ

## "Бібліятэка- скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці"

**Мэта экскурсііі:**

- 1. Духоўна – маральнае і культурнае выхаванне.
- 2. Павышэнне цікавасці да гісторыі бібліятэк і прывабліванне да карыстання імі.
- 3. Папаўненне ведаў аб ролі бібліятэк ў жыцці чалавека.



**Задачы экскурсіі:**

- Пазнаёміць з гісторыяй бібліятэк Полацка як сховішчам духоўнай і культурнай спадчыны са старажытных часоў і па сённяшні час.
- Паказаць асветніцкую і адукацыйную місію бібліятэк.
- Раскрыць роль сучасных бібліятэк Полацка як культурна-інфармацыйных цэнтраў .



**Месца сустрэчы з групай:**

- Полацкі Спаса-Еўфрасінneўскі манастыр



**Працягласць экскурсіі:**

- 150 хвілін.

**Адлегласць маршрута:**

- 4 км



**Склад экскурсантаў:**

- дарослыя, дзеці

**Від экскурсіі:**

- аўтобусная

# Маршрут экскурсіі

"Бібліятэка- скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці"

| | |
|---|---|
| **СТАРТ** вул. Е.Полацкай, 89 | • БІБЛІЯТЭКА СПАСА-ЕФРАСІННЕЎСКАГА МАНАСТЫРА |
| вул. Замкавая,1 | • САФІЙСКІ САБОР |
| вул. Стрэлецкая, 4 | • БІБЛІЯТЭКА ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА |
| вул. Ніжне-Пакроўская,22 | • МУЗЕЙ-БІБЛІЯТЭКА СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА |
| вул.Гогаля,15 | • ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ |

*Тэхналагічная карта экскурсійнага маршруту “Бібліятэка - скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці”*



# Маршрут экскурсіі. Падарожжа ДРУГОЕ

## "Бібліятэка - скарбніца багацця чалавечага розуму, крыніца духоўнасці"




1 Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр
2 Сафійскі сабор
3 Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
4 Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага
5 Цэнтральная раённая бібліятэка ім. Ф. Скарыны

***“Народным мы завёмся аб’яднаннем,
А значыць, абавязаны тварыць”***

*Загурская Г.*

Калектывы літаратараў Полаччыны аб’яднаны адным рамяством-майстэрствам ствараць у паэзіі і прозе творы, вартыя ўвагі чытача. Пакаленне за пакаленнем прыходзяць ў аб’яднанні палачане. Не перапыняюцца традыцыі. Удзельнікі аб’яднанняў рэгулярна выпускаюць у свет плён сваёй творчасці- калектыўныя і аўтарскія зборнікі, друкуюцца ў гарадскім, абласным і рэспубліканскім друку. З’яўляюцца ўдзельнікамі шматлікіх праектаў, мерапрыемстваў, фестываляў. І трымаюць устойлівы курс на сустрэчу з чытачамі любога ўзросту.

Народнае літаратурнае аб’яднанне “Надзвінне”




У 1926г. Полацкая філія “Маладняка”выпусціла першы нумар альманаха “Надзвінне”. Гэта назва замацавалася за Полацкім літаратурным аб’яднаннем, якое існуе і цяпер.На самым пачатку ў рабоце згуртавання літаратараў актыўны ўдзел прымалі вядомыя пісьменнікі Беларусі  Алесь Дудар, Алесь Звонак, Ян Скрыган.. У 1930-я гады заявілі пра сябе Эдуард Самуйлёнак, Пятрусь Броўка, Тарас Хадкевіч. У літаб’яднанні рабілі свае першыя крокі у літаратуру члены Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Савіцкі, Генадзь Бураўкін, Валянцін Лукша, Іван Стадольнік,  Навум Гальпяровіч, Валянціна Аколава.

***Вул. Ніжне-Пакроўская, 27***



ГУК “Полацкі раённы цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур” (РЦНК )

## Народнае літаратурнае аб'яднанне "Полоцкая ветвь"

У 1989 годзе полацкімі паэтамі было ўтворана літаратурнае аб'яднанне "Полоцкая ветвь". У выніку зліцця аднайменных творчых аб'яднанняў, якія існавалі ў Полацку і Мінску, у 1994 годзе быў утворан Беларускі літаратурны саюз.. У яго склад уваходзяць больш за 50 прадстаўнікоў рускамоўных літаратурных аб'яднанняў з Гомеля,Брэста, Полацка, Наваполацка, Віцебска і Мінска.

***ГУК "Полацкі гарадскі палац культуры" (ГПК)***
***Вул. Гогаля д.15***

## Народнае літаратурнае аб'яднанне "Литературный ковчег"

У 2007 годзе. пры раённым цэнтры культуры было ўтворана літаратурнае аб'яднанне "Литературный ковчег". Мэта аб'яднання-сабраць пад сваё крыло творчых людзей рознага ўзросту з горада Полацка і Полацкага раёна.За непрацяглы час існавання аб'яднання выдала звыш 50 зборнікаў прозы і паэзіі сваіх аўтараў. Асноўнай дзейнасцю аб'яднання з'яўляецца папулярызацыя мастацкага слова. Мясцовых паэтаў, пісьменнікаў, бардаў можна чуць на гарадскіх і раённых пляцоўках, на сустрэчах у вясковых клубах і школах..

***ГУК "Полацкі раённы цэнтр культуры (РЦК)***
***Вул. Свярдлова,18а***

## Літаратурная студыя "Цэнтр Еўропы"

**Студыя "Цэнтр Еўропы"** аб'ядноўвае творчую інтэлігенцыю г.Полацка. Адчынена 20 сакавіка 2018г. на базе Цэнтральнай бібліятэкі імя Ф.Скарыны. Для больш 90 паэтаў і празаікаў рэгіёна яна стала месцам правядзення дыскусій, прэзентацый, творчых сустрэч з чытачамі. Тут маецца канферэнц-зала, спецыяльныя выставы, на якіх прадстаўлены творы і ўзнагароды майстроў мастацкага слова. Яе дзейнасць цесна звязана з міжнародным літаратурным фестывалем "Цэнтр Еўропы", які праводзіцца штогод, і накіравана на ўмацаванне міжнародных сувязяў у галіне культуры і літаратуры. Партнёры фестывалю: Саюз пісьменнікаў Беларусі, Расіі, Украіны і іншых замежных краін.

# Падарожжа ТРЭЦЯЕ

## "Народным мы завёмся аб'яднаннем, а значыць, абавязаны тварыць"

| | |
|---|---|
| ***Мэта экскурсіі:*** | • 1. Азнаямленне з гісторыяй і сучасным становішчам народных літаратурных аб'яднанняў Полацка.<br>• 2.Прывабліванне да напісання паэтычных і празаічных твораў. |
| ***Задачы экскурсіі:*** | • 1.Расказаць пра літаратурныя аб'яднання Полацка і іх выдавецкую дзейнасць.<br>• 2.Раскрыць ролю літаратурных аб'яднанняў ў развіцці беларускай літаратуры нашай краіны.<br>• 3.Пазнаёміць з пісьменнікамі, выхадцамі з літаратурных аб'яднанняў і іх творамі. |
| ***Месца сустрэчы з групай:*** | • Полацкі раённы цэнтр ramёстваў і нацыянальных культур |
| ***Працягласць экскурсіі:*** | • 140 хвілін. |
| ***Адлегласць маршрута:*** | • 1 км |
| ***Склад экскурсантаў:*** | • дарослыя, дзеці |
| ***Від экскурсіі:*** | • пешаходная |



# Маршрут экскурсіі

## "Народным мы завёмся аб'яднаннем, а значыць, абавязаны тварыць"

| | |
|---|---|
| **СТАРТ** вул. Ніжне-Пакроўская, 27, | • 1. "ПОЛАЦКІ РАЁННЫ ЦЭНТР РАМЁСТВАЎ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР". Народнае літаратурнае аб'яднанне "Надзвінне" |
| •вул. Свярдлова,18а | • 2. "ПОЛАЦКІ РАЁННЫ ЦЭНТР КУЛЬТУРЫ", Народнае літаратурнае аб'яднанне "Литературный ковчег" |
| •вул.Гогаля д.15 | • 3. "ПОЛАЦКІ ГАРАДСКІ ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ" Народнае літаратурнае аб'яднанне "Полоцкая ветвь" |
| •вул. Гогаля д. 15 | • 4. ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ. Літаратурная студыя "Цэнтр Еўропы" |

*Тэхналагічная карта экскурсійнага маршруту "Народным мы завемся аб'яднаннем, а значыць абавязаны тварыць"*

*Дадатак "Іх імёны ў назвах вуліц старажытнага Полацка"*



# Маршрут экскурсіі. Падарожжа ТРЭЦЯЕ

"Народным мы завёмся аб'яднаннем, а значыць, абавязаны тварыць"




1 **Полацкі раённы цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур.**

2 **Полацкі раённы цэнтр культуры**

3 **Полацкі гарадскі палац культуры**

4 **Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.Скарыны.**



# ”СПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА”

***”СПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА”-***

***Гэтая евангельская ісціна, якая нарадзілася стагоддзі назад, не страчвае свайго глыбокага сэнсу і сёння. Са слоў склалася КНІГА, увабраўшы ў сябе мудрасць мноства пакаленняў нашых продкаў. Сучасныя гаджэты трывала ўвайшлі ў наша паўсядзённае жыццё, і гэта, безумоўна- адметная рыса сённяшняга дня. Але ці параўняецца чытанне электроннай кнігі з асалодай, якую мы атрымліваем, гартаючы старонкі кнігі папяровай? Кніга сілкуе душу, дорыць эмоцыі, фарміруе асобу…***

***Давайце ж шанаваць яе, давайце дарыць сабе найвялікшую з раскошаў- чытанне!***

*УА “Полацкая дзяржаўная гімназія №2*
*Аўтары і складальнікі: Катовіч М.У. – бібліятэкар*



## “Рыцарская культура сярэдневяковага горада”

### Тлумачальная запіска

У сучаснай эканоміцы экспарт турыстычных паслуг адыгрывае ўсё больш значную ролю. У рэйтынгу сусветнага экспарту яны займаюць 4 месца пасля паліўна-энергетычнай, хімічнай і аўтамабільнай галін вытворчасці. Сусветны эканамічны форум сумесна з Міжнароднай асацыяцыяй авіяперавозак, Сусветным саветам па падарожжах і турызму і Сусветная турыстычная арганізацыя вызначылі новы рэйтынг канкурэнтназдольнасці сектара падарожжа і турызму. У першую дзясятку ўвайшлі Швейцарыя, Германія, Аўстрыя, Іспанія, Велікабрытанія, ЗША, Францыя, Канада, Швецыя, Сінгапур. Расія заняла толькі 64 месца, а Беларусь у гэты рэйтынг увогуле не ўвайшла. Тым не менш даходы ад турызму ў Беларусі склалі 260 млн. долараў (2013 г.) У 2014 годзе плануецца іх павелічэнне на 100 млн. долараў. Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь агучыла рэйтынг самых папулярных турыстычных аб’ектаў краіны. Лідарам па наведванні ў 2013 годзе стаў Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», на другім месцы – мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», на трэцім – Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, на чацвёртым - замкавы комплекс «Мір», на пятым – Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей- запаведнік.

Найбольш паспяхова развіваецца турыстычная галіна ў Гродненскай і Віцебскай абласцях. Згодна статыстыкі, толькі Полацкі рэгіён у 2013 годзе наведалі больш за 45 тысяч арганізаваных турыстаў (у тым ліку 19 тысяч – замежных), 100 тысяч неарганізаваных турыстаў і 47 940 паломнікаў.

У горадзе Полацку распрацаваны і паспяхова ажыццяўляюцца шматлікія турыстычныя (экскурсійныя) маршруты. Аднак экскурсійныя магчымасці горада неабмежаваныя.

Экскурсія на тэму«Рыцарская культура сярэдневяковага горада», распрацаваная членамі гуртка «Юны экскурсавод», дае магчымасць не толькі тэарэтычна пазнаёміцца з багатай гісторыка-культурнай спадчынай, але і ажыццявіць практычнае паглыбленне ў эпоху сярэдневякоўя, далучыцца да каштоўнасцей таго часу.

Пры падрыхтоўцы экскурсійнага маршрута ажыццяўляецца папярэдняя дамоўленнасць аб супрацоўніцтве з прыватным Музеем рыцарскай культуры, Цэнтрам рамёстваў і нацыянальных культур,



Народным тэатрам гістарычнага касцюма «Полацкі звяз», канцэртнай залай «Сафійскі сабор».

*Сустрэча экскурсавода адбываецца на пляцоўцы каля Музея рыцарскай культуры. Ён знаёміцца з групай. Агучвае тэму экскурсіі, яе мэту і задачы, коратка характарызуе маршрут і яго аб'екты, адзначае час пачатку і заканчэння экскурсіі.*

Добры дзень, шаноўнае спадарства! Вітаем вас у старажытным горадзе Полацку.

Цэнтральнай фігурай любога горада з'яўляецца чалавек. Менавіта людзі з іх паўсядзённымі клопатамі ствараюць аснову гарадскога жыцця. У сярэдневяковых гарадах гандлёва-рамеснае насельніцтва пражывала на пасадах. У гэтых адносінах Полацк не быў выключэннем. Дзякуючы пасадскім людзям – творцам гандлю і рамяства, стала магчымым існаванне Полацка як першага горада на тэрыторыі Беларусі. Тэма нашай з вамі экскурсіі дазволіць дакрануцца да адной з старонак гісторыі горада – таямнічай эпохі сярэдневякоўя. Падчас экскурсіі, якая будзе працягвацца 120 хвілін, вы зможаце пазнаёміцца з гісторыяй горада і яго сімвалам – Сафійскім саборам, пабачыць сапраўдны штурм сярэдневяковага замка, наведаць Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур, на некаторы час стаць рамеснікамі і сваімі рукамі зрабіць «штуку», у Музеі рыцарства пазнаёміцца з гісторыяй рыцарскай культуры і эпохай Андрэя Полацкага.

Полацк упершыню заявіў пра сябе на старонках старажытнага славянскага летапісу «Аповесць мінулых гадоў» пад 862 годам як цэнтр заходняй галіны крывічоў, якія пражывалі на адным з напрамкаў вядомага гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі».

***Аб сваёй адвазе не крычалі,***
***Гаварылі праўду толькі ўслых...***
***І з якой прычыны крывічамі***
***Летапісцы ахрысцілі іх?***
***Родны бераг ад прыблудаў стойка***
***Крывічы спрадвеку бераглі –***
***Крыві праліта ў войнах столькі,***
***Што назваць інакш іх не маглі.***

*(У. Скарынкін.Крывічы)*



Сучасныя вучоныя не без падстаў лічаць, што племянны саюз крывічоў адыграў першасную ролю ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці. Полацкая зямля ўяўляе сабой унікальны прыклад, калі палачане-крывічы аб’ядналі суседнія воласці-княствы, і цэнтрам гэтага аб’яднання стаў Полацк.

У 2001 г. у горадзе ўстаноўлены помнік продкам-крывічам (*дэманструецца выява з «партфеля экскурсавода», дадатак 1*). Вядомы беларускі скульптар Алесь Шатэрнік стварыў кампазіцыю: у ладдзі, якая сімвалізуе стыхію вады, стаіць фігура княгіні з сынам, справа ад яе – дружыннікі-ваяры. Помнік знаходзіцца на тэрыторыі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Летапісны Полацк размяшчаўся ў 800 метрах ад упадзення Палаты ў Заходнюю Дзвіну – сёння гэта малазаўважны пагорак непадалёку ад Чырвонага маста, які шчыльна забудаваны прыватнымі дамамі. Але менавіта тут пачынаўся Полацк, менавіта тут знаходзіўся горад легендарнага Рагвалода, які прыйшоў «з-за мора». Гарадзішча выконвала ролю дзядзінца – умацаванай крэпасці, было ідэалагічным цэнтрам, месцам канцэнтрацыі рамяства і пражывання свецкай і духоўнай адміністрацыі, выконвала функцыю абароны князя і пасадскага люду ў часы ваеннай небяспекі.

Суперніцтва Полацка з Ноўгарадам і Кіевам з-за кантролю над гандлёвым шляхам па Заходняй Дзвіне прывяло да вайны 980 года, у выніку якой былі забіты Рагвалод і яго сыны. Полацк трапіў у падпарадкаванне наўгародскаму (потым кіеўскаму) князю Уладзіміру, а дачка Рагвалода – Рагнеда –стала яго жонкай. Падзеі гэтага часу адлюстраваны на памятных марках РУП «Белпошта» і памятных манетах Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

(*дэманструюцца выявы, дадатак 2, 3*).

Аб гэтых падзеях распавядаюць не толькі творы мастацкай літаратуры, такія, як «Тры жыцці княгіні Рагнеды» К.Тарасава, але і балет «Страсці (або «Рагнеда»), аўтарам якога з’яўляецца А. Мдзівані. Пастаўлены балет В. Елізар’евым.

Сын Рагнеды і Уладзіміра – Ізяслаў – аднавіў полацкую княжацкую дынастыю і ўвайшоў у гісторыю як князь - кніжнік. А ў праўленне яго ўнука – Усяслава Чарадзея (1044-1101) – Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці. Памяць Усяслава таксама ўшанавана ў Полацку (*дэманструецца помнік Чарадзею з «партфеля*

*экскурсавода», дадатак 4*) у 2007 годзе. Аўтары - скульптары А.Прохараў, С.Ігнацьеў, Л.Мінкевіч, Д.Сакалоў.

Яшчэ пры жыцці Усяслаў Чарадзей падзяліў княства паміж сваімі 6 сынамі. У хуткім часе ўдзельныя княствы, што існавалі на тэрыторыі Беларусі ў XIII ст., сталі шукаць паміж сабой кантактаў у эканамічных і палітычных сферах. Полацкая зямля перажывала апошнія старонкі гісторыі калісьці моцнай дзяржавы. Пачынаўся новы перыяд - перыяд у складзе ВКЛ.

У сярэдзіне XIII ст. цэнтр палітычнага жыцця на беларускіх землях перайшоў да Наваградка, які ў перыяд вялікіх супрацьстаянняў з крыжакамі і татара-манголамі быў адносна бяспечнай тэрыторыяй. Наваградская зямля і стала ядром нараджэння новай дзяржавы - Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Пасля працяглага перыяд у феадальнай раздробленасці ў 1307 годзе Полацк са згоды мясцовага насельніцтва ўвайшоў у склад ВКЛ, атрымаўшы пры гэтым правы аўтаноміі. Ён быў адным з буйнейшых гарадоў княства. У «Хроніцы Польшчы» пад 1388 г. Полацк названы замкам (крэпасцю) Белай Русі. А час быў неспакойны.

***Дзяды нашы білі драпежнікаў прускіх,***
***Не даўшы надзець на сябе кайданы, -***
***Пад Грунвальдам білі, на возерыЧудскім,***
***Там разам з украінскім братам і рускім,***
***Сваю Беларусь баранілі яны.***
***Змагаліся з рознай напасцю варожай,***
***Прайшлі па смаленскіх, палтаўскіх палях,***
***Ішлі казакамі, ў стэп Запарожжа,***
***І верылі цвёрда – ніхто іх не зможа***
***Бо вечнаю праўдай жыла іх зямля.***

*(П. Броўка. Беларусь)*

Адным з найбольш вядомых кіраўнікоў Полацка стаў Андрэй Альгердавіч (1342-1377, 1381-1387). Помнік Андрэю Полацкаму ўсталяваны ў 2009 годзе. Аўтарам з'яўляецца скульптар І.Голубеў. Перыяд праўлення Андрэя Полацкага – складаны час у гісторыі беларускай дзяржаўнасці, час барацьбы за захаванне тэрытарыяльнай

цэласнасці і незалежнасці дзяржавы. Ударнай сілай гэтай барацьбы выступіла шляхецкае саслоўе - рыцарства.

З ваярскім ўзбраеннем IX-XIV стагоддзяў, гісторыяй княжацкай дынастыі Альгердавічаў, палітычнымі падзеі апошняй чвэрці XIV стагоддзя, якія змянілі гісторыю не толькі Полацка, але і ўсяго Вялікага Княства Літоўскага, нас пазнаёміць экспазіцыя Музея рыцарскай культуры.

### Наведванне Музея рыцарскай культуры

Зараз вашай ўвазе пранауецца анімацыйная праграма «У старажытным замку», тэатралізаванае прадстаўленне рыцарскіх турніраў «Ратна кола», а таксама інтэрв'ю з кіраўнікам калектыву «Полацкі звяз» Яўгеніяй Кавалёвай.

Тэатралізаванае відовішча прадставіць Народны тэатр гістарычнага касцюма «Полацкі звяз», які існуе з 2002 года і аб'ядноўвае людзей featuring рознага ўзросту і прафесій. Калектыў прымае актыўны ўдзел у святочных мерапрыемствах у Полацку і па-за яго межамі. Дзякуючы ініцыятыве «Полацкага звяза» нарадзіўся і праходзіць у горадзе над Дзвіною Фестываль сярэдневяковай культуры «Рубон», які вядомы не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў Расіі, Украіне, Літве, Латвіі, Эстоніі, Польшчы.

### Размова з Я. Кавалёвай

«Ратна кола» - гэта спаборніцтвы рыцараў. Правілы рыцарскіх турніраў склаліся ў XI-XIII стст. Іх удзельнікі павінны былі карыстацца аднолькавай зброяй. Часцей за ўсё удзельнікі на конях імчаліся адзін на аднаго, трымаючы коп'і наперавес. Калі коп'і ламаліся, браліся за мячы, пасля – за булаву. Зброя была тупой, і рыцары імкнуліся толькі выбіць суперніка з сядла. Пры правядзенні турніра пасля мноства індывідуальных паядынкаў, якія працягваліся некалькі дзён, адбывалася галоўнае спаборніцтва - імітацыя бітвы двух атрадаў.

Рыцарская культура, такім чынам, гэта культура, якая склалася ў ваенна-землеўладальніцкім саслоўі Еўропы. Яе састаўной часткай быў прыдворны этыкет – куртуазія. Куртуазія ўключала ў сябе мастацтва размовы ваяра з жанчынай, уменне адзявацца, навыкі танцаў, складання вершаў і спеваў. У адзенні і рыцараў, і жанчын сазнатных сем'яў выкарыстоўваліся ўпрыгожванні, зробленыя сваімі рукамі або рукамі сярэдневяковых рамеснікаў.

### Рух па вул. Ф. Энгельса, пераход на вул. Ніжне-Пакроўскую, 27

У эпоху сярэдневякоўя Полацк з'яўляўся не толькі адміністрацыйным і рэлігійным цэнтрам, але і цэнтрам развіцця гандлю і рамяства. Палачане займаліся кавальствам, бондарствам, апрацоўкай і вырабам скуры, дрэва, каменю, ганчарствам, прадзеннем, ткацтвам. Рамесная справа ўдасканальвалася, зведвала ўплыў тэхнічнага прагрэсу і сёння не мае такога вялікага значэння ў жыцці чалавека, як у сярэдневякоўі. Але таямніцы рамяства не страчаны і сёння, актыўна адраджаюцца. Адным з месцаў, дзе гэта адбываецца, з'яўляецца гарадскі Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур, які быў створаны ў 1994 годзе. Тут арганізаваны курсы шыцця з ласкутоў і майстар-класы па кераміцы, вышыўцы, саломапляценню і ткацтву. Наведаць іх можа кожны жадаючы.

**Наведванне аднаго з майстар-класаў (па выбары экскурсантаў)**

У XI ст. горад пашырыў свае межы. На правым беразе Заходняй Дзвіны, там, на ўзвышаным участку з абрывістымі схіламі плошчай звыш 9 га, пачаў стварацца цэнтр Полацка, які існаваў тут да XVII стагоддзя. Вучоныя мяркуюць, што гэтае месца першапачаткова было сакральным для палачан, магчыма, тут у дахрысціянскі час існавала капішча. З цягам часу гэта ўзвышша стала называцца Верхні замак, а ў старажытнасці гэта была Чорная гара.

**Рух па вул. Ніжне-Пакроўскай да Верхнягя замка**

З усіх бакоў Верхні замак быў ўмацаваны прыродай. З поўдня гэтае месца закрывала рака Дзвіна, з захаду і часткова з поўначы - Палата, а з усходу ў старажытнасці праходзіў глыбокі роў, дзе працякаў Чорны ручай. Паўночна-ўсходняя частка Верхняга замка паніжана і прымыкае да Ніжняга замка. Менавіта там у старажытнасці быў уваход і ўезд з боку Вялікага пасада – Каралеўская вежа. Верхні замак фарміраваўся на працягу некалькіх стагоддзяў. Паводле крыніц XVI-XVII стст., ён быў акружаны валам, драўлянымі сценамі і вежамі, у XVI ст . якіх было 9. З узнікненнем у XVI ст. Ніжняга замка Замкавую гару сталі называць Верхнім замкам.

Неаднаразова за сваю гісторыю сцены Верхняга замка баранілі палачан ад нападу ворагаў. Зараз вы пабачыце, як адбываўся штурм замка ў эпоху позняга сярэдневякоўя.

**Наведванне тэатралізаванага прадстаўлення «Штурм замка»**



У 50-я гг. XI ст. на Верхнім замку ўзнік трэці цуд праваслаўя ў славянскім свеце – Сафійскі сабор.

### *Рух на вул. Замкавую,1*

Першапачаткова Сафійскі сабор уяўляў сабой 5-нефавую крыжова-купальную 16-слуповую базіліку, завершаную 7 купаламі і меў даўжыню 31,5 м, а шырыню 26,4 м.

У выніку пажару сярэдзіны XV ст. сабор перабудаваны ў 5-вежавы храм абарончага тыпу. Падчас Паўночнай вайны 1700-1721 гадоў у прытворы храма размяшчаўся парахавы склад, які 1 мая 1710 года ўзарваўся, пасля чаго Сафійскі сабор быў цалкам разбураны і праляжаў у руінах да 1738 года.

Аднаўленне сабора здзейсніў уніяцкі архіепіскап Фларыян Грабніцкі. Да 1750 года на захаваных рэштках сцен была збудавана двухвежавая базіліка ў стылі віленскага барока. У 1911-1914 гады быў праведзены капітальны рамонт сабора. У 1924 года ў рамках савецкай атэістычнай палітыкі царкву зачынілі і размясцілі ў ёй краязнаўчы музей. У пасляваенны час сабор зноў быў зачынены.

У 1983 годзе Сафійскі сабор адчынілі як залу камернай, а ў 1985 годзе - арганнай музыкі. Чэшскай фірмай «Рыгер Клос» устаноўлены арган, створаны па індывідуальным праекце. Арган – гэта клавішна-духавы музычны інструмент. Першыя арганы ўзніклі яшчэ ў старажытнасці. Але шырокае распаўсюджанне атрымалі ў сярэдневякоўі. Яны былі грубай работы: ручная клавіятура складалася з клавішаў шырынёй ад 5 да 7 см, адлегласць паміж клавішамі дасягала 1,5 см. Ударалі па клавішах не пальцамі, як зараз, а кулакамі. У XV ст. былiпаменшаныклавiшыi павялічана колькасць труб.

Арган Сафійскага сабора - сярэдні па велічыні: мае 3905 труб. Адны з іх драўляныя, выраблены з розных парод дрэва, а другія - з розных металічных сплаваў. Самыя вялікія трубы аргана маюць 6-метровую вышыню і паўметровы дыяметр, самыя маленькія - не больш за аловак. Групы труб аб'яднаны ў рэгістры - галасы аргана. У аргане Сафійскага сабора - 48 рэгістраў.

Арган мае 3 ручныя клавіятуры - мануалы - і нажную - педаль, якая складаецца з 30 клавішаў. Паветра ў арган Сафійскага сабора нагнятаецца з дапамогай электраматора.



Салісткай канцэртнай залы Сафійскага сабора з'яўляецца Ганаровы грамадзянін горада Полацка, лаўрэат міжнародных конкурсаў Ксенія Пагарэлая.

Кожную нядзелю ў Сафійскім саборы праходзіць канцэрт арганнай музыкі. Двойчы ў год сабор становіцца цэнтрам музычнага жыцця Беларусі. Вясной праходзіць Міжнародны фестываль старадаўняй і сучаснай камернай музыкі, а восенню - Міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». Сюды прыязджаюць лепшыя выканаўцы з СНД і Еўропы.

У Сафійскім саборы арганічна спалучаецца гісторыя і музыка. Сабор нагадвае нам пра мінулае, звязваючы яго з сучаснасцю і будучым.

### *Наведванне канцэрта арганнай музыкі ў Сафійскім саборы*

За 11 стагоддзяў сваёй гісторыі Полацк не раз перажываў уздым і перыяды заняпаду. Узнік як гандлёвы і рамесны цэнтр на Палаце, у X-XII стст. ён быў сталіцай Полацкай зямлі. З 1307 па 1569 г. – 262 гады - ўваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, з 1569 па 1772 гг. – 203 гады - жыў у складзе Рэчы Паспалітай, пасля - ў складзе Расійскай імперыі з 1772 па 1918 г. – 145 гадоў. У складзе СССР – 74 гады. Сёння Полацк - невялікі горад Віцебскай вобласці, але гістарычная і духоўная значнасць ставіць яго побач са старажытнейшымі славянскімі гарадамі – Псковам, Ноўгарадам і Смаленскам, равеснікам якіх ён з'яўляецца. Полацк, нягледзячы на перыпетыі лёсу, захаваў сваю сталічную веліч, багатую гістарычную і культурна-духоўную спадчыну.

### *Рух па Ніжне-Пакроўскай, пераход на вул. Ф. Энгельса*

Сёння мы з вамі падчас экскурсіі пазнаёміліся толькі з адной са старонак Полацка – рыцарскай культурай. Матэрыял экскурсіі не з'яўляецца вычарпальным. Гэта першая ступень для раскрыцця ўсіх таямніц эпохі сярэдневякоўя.

### *Развітанне з групай*



# Спіс выкарыстаных крыніц


1. Дэйніс І.П. Полацкая даўніна. – Мн., 2007.
2. Каліноўскі І. Полацк і яговаколіцы. – Мн., 2005.
3. Полоцк: исторический очерк. – Мн., 1987.
4. Слюнченко, В.Г. Полоцкий Софийский собор. – Мн., 1987.
5. Там, дзе вежы Сафіі: Полаччына літаратурная: Проза, паэзія / Уклад. Н.Гальпяровіч – Мн., 2003. С. 39-43, 122-125, 151-152, 186, 275.
6. Тарасаў С. Чарадзей сёмага веку Траяна. Усяслаў Чарадзей. - Мн., 1991.
7. Памяць: Гіст. дакум. хроніка Полацка. – Мн., 2002.
8. Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли (IX- XIII вв.). – Мн., 1978.
9. Шамов В. П. Полоцк – город древний. – Мн., 1987.




# Падарожжа ЧАЦВЁРТАЕ

## "Рыцарская культура сярэднявяковага горада"









**Мэта экскурсіі:**

- садзейнічаць фарміраванню цэласнага ўяўлення экскурсантаў аб эпосе сярэднявякоўя, паглыбляючы іх веды па гісторыі Полацка шляхам спалучэння традыцыйных і інтэрактыўных метадаў пазнавальнай дзейнасці

**Задачы экскурсіі:**

- знаёміць з гісторыяй фарміравання рыцарскай культуры ў перыяд сярэднявякоўя.
- стварыць умовы для далучэння экскурсантаў да традыцыйных рамёстваў.
- спрыяць фарміраванню пачуцця павагі да Радзімы, іншых народаў, зацікаўлекасці да роднай гісторыі і нацыянальных традыцый.

**Месца сустрэчы з групай:**

- вул. Ф. Энгельса, 3

**Працягласць экскурсіі:**

- 120 хвілін

**Адлегласць маршрута:**

- 2 км

**Склад экскурсантаў:**

- дарослыя, дзеці

**Від экскурсіі:**

- пешаходная



# Маршрут экскурсіі. Падарожжа ЧАЦВЁРТАЕ

## "Рыцарская культура сярэдневяковага горада"

| | |
|---|---|
| **вул. Ф.Энгельса, 3** | • **ПОМНІК АНДРЭЮ ПОЛАЦКАМУ** |
| **вул. Ф.Энгельса, 3** | • **МУЗЕЙ РЫЦАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ** |
| **вул. Ніжне-Пакроўская, 27** | • **ЦЭНТР РАМЁСТВАЎ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР. Майстар-класы па традыцыйных рамёствах** |
| **вул. Ніжне-Пакроўская** | • **Тэатралізаванае прадстаўленне «ШТУРМ ЗАМКА»** |
| **вул. Замкавая, 1** | • **САФІЙСКІ САБОР**<br>• **Канцэрт арганнай музыкі ў Сафійскім саборы** |

*Тэхналагічная карта экскурсійнага маршруту "Рыцарская культура сярэдневяковага горада"*

***Партфель экскурсавода*** *(Падарожжа чацвёртае)*



# Маршрут экскурсіі

## “Рыцарская культура сярэднявяковага горада”




1 **Помнік Андрэю Полацкаму**
2 **Музей рыцарскай культуры**
3 **Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур**
4 **Сафійскі сабор**

*Месцы адпачынку і забаў*




ПОЛОЦК
ГЕОГРАФИЧЕСКИЙ ЦЕНТР ЕВРОПЫ